Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры

27.11.2018

# ПОСТ-РЭЛІЗ мерапрыемства "За крокам крок…"

Вольга Шаўчэнка

**ПОСТ-РЭЛІЗ**

мерапрыемства

**"За крокам крок…",**

прысвечанае прэзентацыі кнігі

"Леанід Дайнека.

Выбраныя творы"

**27 лістапада 2018 года** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбылося мерапрыемства **"За крокам крок…"**, прысвечанае прэзентацыі кнігі **"Леанід Дайнека. Выбраныя творы"**, якая пабачыла свет у выдавецтве "Беларуская навука" у серыі "Беларускі кнігазбор".

У 96 том серыі ўвайшлі новыя раманы Леаніда Дайнекі "Ілоты" і "Сын ільва, дачка Зеўса – Леанід і Зінаіда". Таксама ў аднатомнік вядомага беларускага пісьменніка ўвайшлі найбольш значныя яго вершы і мініяцюры "Герадоцінкі".

Павіншаваць творцу прыйшлі яго сябры, калегі і даследчыкі. Аўтар праекта і галоўны рэдактар серыі "Беларускі кнігазбор" Кастусь Цвірка і вядучы рэдактар выдавецтва "Беларуская навука" Георгій Кісялёў адзначылі важнасць гэтай серыі і мастацкую вартасць творчасці Леаніда Дайнекі. Сябры па пяру пісьменнікі Сяргей Законнікаў і Леанід Дранько-Майсюк падзяліліся сваімі ўражаннямі аб прачытаных творах пісьменніка. Паэт і перакладчык Міхась Скобла згадаў ранейшыя творы пісьменніка, а з гістарычнага рамана "Назаві сына Канстанцінам" зачытаў цытаты, якія можна назваць фразеалагізмамі. Даследчыца творчасці Леаніда Дайнекі, вядучы бібліёграф інфармацыйна-аналітычнага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Таццяна Лаўрык распавяла, што ў дзяцінстве зацікавілася раманамі Леаніда Дайнекі і з цікавасцю даследуе яго творчасць. Звярнула ўвагу на караценькія гісторыі "Герадоцінкі", якія складаюцца з гістарычных замалёвак і філасофскіх разважанняў. Павіншаваць Леаніда Дайнеку з выхадам кнігі "Леанід Дайнека. Выбраныя творы" прыйшлі барды Алесь Камоцкі з песнямі "Ляцяць гады немаладыя" і "Тутэйшы чалавек" і Эдуард Акулін з кампазіцыяй

пра беларускага песняра Янку Купалу. Пад час імпрэзы гучалі вершы ў выкананні творцы Леаніда Дайнекі.

Вядучы рэдактар выдавецтва “Беларуская навука” Георгій Кісялёў запрасіў прысутных на аўтограф-сесію ў “Акдэмкнігу”.

*вядучы навуковы супрацоўнік Вольга Шаўчэнка*